# Разважанні над паэмай А. Куляшова “Цунамі”.

“Цунамі” (1968 г.) – умоўна-абстрактная паэма з узбуйненым філасофскім пачаткам, у якой Аркадзь Куляшоў спрабуе асэнсаваць стан грамадства 70-х гг. і накрэсліць перспектывы будучыні чалавецтва ў век тэрма-ядзерных эксперыментаў. Паэма “Цунамі” -- своеасаблівае прарочае прадбачанне і Чарнобыля з яго наступствамі, і нават нью-йорскай катастрофы. Час паказаў, што канфлікты падобных маштабаў перастаюць быць лакальнымі, яны тычацца як асобнага чалавека, так і ўсяго чалавецтва.

Будучыня грамадства ў паэме “Цунамі” спраектавана на лёсе двух кахаючых, якія спрабуюць адасобіцца ад людзей, ад набыткаў цывілізацыі і яе шкодных уплываў, згубіцца ў часе і прасторы.

Юнацкі максімалізм закаханых вымагае хлопца і дзяўчыну “пакінуць за бартом былое”, “шумлівы свет людскі”, “не лічыцца з часам”, цалкам забыцца на дасягненні цывілізацыі, каб “прайсці самім адлегласць ад таемных “ пячорных знакаў да лемантара” (1, 280).

Чым кіруюцца маладыя ў сваіх памкненнях? Адказ А. Куляшоў дае такі:

“Як добра ім адным!...

Які спакой!” (1, 281)

Такім чынам, як сцвярджае паэт, у сучасным свеце надзвычай востра паўстала пытанне: як ураўнаважыць нястрымны рух цывілізацыі, ціск інфармацыйнага прэсінгу і патрэбу чалавека часам засяродзіцца ў сабе, пабыць сам-насам, самаадасобіцца. Невырашальнасць гэтай праблемы ў мітуслівым грамадстве надзвычай востра адчулі Ен і Яна Аркадзя Куляшова. Менавіта гэта гоніць герояў далей ад зямных клопатаў, турбот, ад “кніжак, фільмаў і газет”. У паўтораных некалькі разоў радках “Які спакой!” адчуваецца радасць вызвалення з палону цывілізацыі, засяроджанасці на ўласных думках, пачуццях, неабходнасць еднасці з прыродай.

Такую еднасць героі А. Куляшова адчуваюць у бязмежным акіяне вады, сонца, неба:

Сышліся твар у твар – яны і вечнасць,
Тут кожны быць павінен сам сабой.
Як смага – смагай, як вада – вадой.
Шукаць выратавання – недарэчнасць. (1, 282)

У сённяшнім мітуслівым свеце, на думку паэта, адзінота патрэбна, каб самазахавацца, убачыць, спазнаць прыгажосць зямлі, свету, адчуць сваю далучанасць да космасу:

Зямля зачараваная планета, -
Тут можна бесклапотным маракам
На лодцы пераехаць з лета ў лета,
З вясны ў зіму –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і лік згубіць гадам (1, 283)

Адыход герояў А.Куляшова ад людзей – гэта адмаўленне ад гвалтоўнага наступства прагрэсу, бунт супраць нівеліравання асобы і свайго “я”. Адзінота ўспрымаецца ў паэме як уцёк ва ўнутраны свет самога сябе, як жаданне самазахавацца. Такім чынам , вельмі актуальная праблема часу, даўно ўзнятая сусветнай літаратурай, знайшла нетрадыцыйнае ўвасабленне ў філасофскай паэме А.Куляшова. Беларускі мастак спалучыў праблему адзіноты чалавека з не менш важнай праблемай выжывання не ў адзіночку, а ўсім светам, супольнасцю.

Самазабыццё, на думку паэта, не можа, не павінна быць вечным для чалавека, яго сацыяльная сутнасць рана ці позна запатрабуе свайго – вяртання ў лона цывілізацыі:

… Ад клопатаў сваіх,
Той свет, які нядаўна караблём знік
За далягляд, не пазбаўляе іх.

Ім ад саміх сябе няма збавення.
На лодцы, дзе раней яна і ён
Жылі спакойна, звіў гняздо трохкутнік. (1, 289)

Трэцім, хто ўвесь час парушае ідылію закаханых, становіцца памяць, яе героі не змаглі пакінуць у грамадстве:

- Чаго прыйшла?
- Каб ты не знаў спакою.
- А праганю?
- З’яўляцца буду ў сне,
  Зязюляй стану, ценем за спіною
  Тваёй! Прагнаць не зможаш ты мяне. (1,286)

Самае балючае выпрабаванне – выпрабаванне гістарычнай памяццю, памяццю роду, але і паратунак чалавецтва, як сцвярджае паэт, у захаванні памяці. Толькі яна здольна выратаваць сусвет, стаць рухавіком прагрэсу.

Жаданне закаханых пакінуць зямлю з яе турботамі, на думку паэта, - гэта спроба самазабыцця, нежаданне быць у адказе за справы людскія. Куляшоў – паэт-філосаф лічыць такі шлях памылковым :

Няма шляхоў да самазахавання,
Няма дарог да светазабыцця
У час ліхі ўзаемапалявання
Сіл супрацьлеглых : смерці і жыцця. (1,292)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выстаяць, выжыць, як сцвярджае паэт, цывілізаваны свет можа толькі аб'яднаўшыся разам, агульнымі намаганнямі можна перамагчы любое зло :

Адзінства гартаваць людзей павінна,
Каб раз'яднанасць не магла ў бацькоў
Бацькоўства адабраць, пазбавіць сына
На хлеб і сонца спадчынных правоў.(1,292)

Але як спалучыць адзінства, салідарнасць і адзіноту, самаадасобленасць, як дасягнуць арганічнага зліцця мужчынскага і жаночага пачаткаў (у канцы падарожжа жанчына пакідае мужчыну, час і выпрабаванні раз'ядналі кахаючых), як дасягнуць гармоніі ў свеце, у чым выратаванне чалавецтва?

Пытанне ёсць, ды на яго няма… адказу.
Хто дасць адказ?

У эпілогу мы маем адказ аўтара, які сцвярджае, што само жыццё, вечнае, няспыннае, вяртае ўсё на кругі свае, а шлях бясконцага пошуку ісціны будзе працягвацца штодзённа.

Каштоўнасць філасофскай паэмы А. Куляшова "Цунамі" не толькі ў глыбокім змесце, які сведчыць аб вялікіх зрухах у мастацкім мысленні паэта, але і ў тым, што мастак плённа працягваў традыцыі інтэлектуальнай, эстэтычна дасканалай літаратуры.

Літаратура:

1.А.Куляшоў. Паміж наступным і былым: Вершы, паэмы. – Мн., 1995.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ